# Публіцыстычны стыль: жанры, сфера выкарыстання

**С. Р. Свірко,**
настаўнік першай катэгорыі
СШ № 2 г. Кіраўска імя К.П.Арлоўскага

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік “Беларуская мова” для 6 класса (Красней В.П., Лаўрэль Я.М., Рачэўскі С.Р.), карткі для арфаграфічнай хвілінкі, апорныя карткі ружовага колеру “Характэрныя прыметы публіцыстычнага стылю”, раздатачны матэрыял жоўтага колеру “Жанры публіцыстычнага стылю”, тэкст пісьма ад расійскіх школьнікаў (блакітныя лісты).

**Мэта:** фарміраванне ведаў пра сферу выкарыстання, асноўныя моўныя прыметы, жанры публіцыстычнага стылю маўлення.

**Задачы:**

- выпрацаваць уменне вызначаць тэксты і сферу выкарыстання публіцыстычнага стылю, называць жанры і асноўныя моўныя прыметы, пісаць лісты;
- садзейнічаць развіццю маўлення, удасканаленню навыкаў працы з тлумачальным слоўнікам;
- абуджаць у вучняў цікавасць да беларускай мовы; выхоўваць добрасардэчныя адносіны да народа Расійскай Федэрацыі.

**Ход урока**

**1.Арганізацыйны этап.**

**Настаўнік:** Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей:
Раніцай:… *(Добрага ранку)*
І апаўдня:…*(Добра дзень)*

Так, добры дзень. Кожная сустрэча пачынаецца з прывітання, а кожны ўрок з жадання вучняў працаваць і здабываць новыя веды. Спадзяюся на нашу плённую сумесную працу. Запішыце дату і тэму ўрока “Публіцыстычны стыль, яго жанры і сфера выкарыстання”

Усе мы гаворым на адной мове, але ў залежнаці ад сітуацыі гаворым па-рознаму. Дома мы гаворым інакш, чым у школе, з сябрамі і блізкімі – не так, як з незнаёмымі. У працэсе выкарыстання мовы, у розных сітуацыях і з рознай мэтай паступова сфарміраваліся асобныя разнавіднасці мовы, якія прынята называць стылямі.

Ці заўважалі вы, што ў розных сітуацыях прыходзіцца карыстацца рознымі моўнымі сродкамі? (*Вучні адказваюць*).

Правільна, і каб не трапіць у недарэчную сітуацыю, трэба ведаць уласцівасці кожнага стылю. Звярніце ўвагу на тэму ўрока, паспрабуйце вызначыць, пра што мы сёння даведаемся. **(Запісаць на дошцы)**

Паглыбім веды пра…

Пазнаёміцца з…

Разгледзець …

**2. Актуалізацыя ведаў**

Напачатку высветлім тое, што вам ужо вядома па тэме. Я зачытваю сцверджанні, а вы згаджаецеся ці не згаджаецеся з імі і адказваеце “так” або “не”. (Метад “Веру-не веру”). На дошцы лісты з правільнымі адказамі (Дадатак 1) .

**3.Знаёмства з новым матэрыялам**

Перш чым мы пазнаёмімся з асаблівасцямі і сферай выкарыстання публіцстычнага стылю, давайце высветлім значэнне слова“публіцыстыка”. Паслухайце казку “Як шукалі значэнне слова “публіцыстыка” і адкажыце, ці правільна казачныя героі разумеюць значэнне гэтага слова.

- *Братка, растлумач мне, калі ласка, значэнне слова “публіцыстыка”, – аднаго разу папрасіў коціка Паласаціка сабачка Жучок.*

*Задумаўся Паласацік. Нялёгка растлумачыць лексічнае значэнне слова “публіцыстыка”. Невядома, ці зразумее яго сусед.*

- *Растлумачыш? – з надзеяй паглядзеў на сябра Жучок.*
- *Публіцыстыка – гэта літаратура па грамадска-палітычных пытаннях, – па-вучонаму пачаў Паласацік.*

*Стаіць Жучок, моргае бусінкамі-вачыма.*

- *Не зразумеў! – уздыхнуў Паласацік. – Ёсць слова "публіка". Чуў такое?*
- *Чуў. Публіка – гэта, гэта…*
- *Па-іншаму, гэта людзі, – падказаў Паласацік.*
- *Цяпер я зразумеў, – сказаў Жучок. – Публіцыстыка адрасавана грамадству, публіцы, людзям.*

**Настаўнік:** Рабяты, Жучок вырашыў, што "публіцыстыка" адрасавана грамадству, публіцы, людзям. А як лічыце вы?… Давайце праверым па слоўніку, якое лексічнае значэнне мае слова"публіцыстыка". Якім слоўнікам вы будзеце карыстацца?

*(Праца з тэрміналагічнымі паняццямі, з тлумачальным слоўнікам.)*

Кожны стыль валодае характэрнымі рысамі. Карыстаючыся, карткамі ружовага колеру (Дадатак 2), назавіце сферу выкарыстання публіцыстычнага стылю, функцыі стылю, стылёвыя адзнакі (моўныя сродкі).

Звернемся ***да практыкавання 412*** на старонцы 236. Паслухайце, калі ласка, тэкст.

- ✓ Да якога стылю належыць тэкст?
- ✓ Якія моўныя сродкі выкарыстаны?

Трэба сказаць, што адзін публіцыстычны тэкст адрозніваецца ад другога. Гэта абумоўлена існаваннем жанраў у гэтым стылі.

Жанр – від тэкстаў, якія адрозніваюцца пэўнымі стылістычнымі адзнакамі. Адны жанры сустракаюцца часцей, іншыя – рэдка. Давайце паспрабуем вызначыць адпаведнасць лексічнага значэння слова пэўнаму жанру. (*Настаўнік падымае жоўтую картку.*) У картках суаднясіце паняцці, запішыце ланцужок адказаў.

- **Індывідуальная работа па картках** (Дадатак 3).

Ключ: 1Д; 2Г; 3Ж; 4Е; 5В; 6З; 7Б; 8 І; 9А (на адваротным баку дошцы)

- **Парная работа.**

Узаемаправерка выкананых работ.

**Настаўніца:** Публіцыстычны стыль выкарыстоўваецца на радыё і тэлебачанні. Скажыце, калі ласка, ці ёсць у вашай сям'і традыцыя ранкам, уключыўшы тэлевізар, знаёміцца з навінамі? (*Дзеці адказваюць*). А ці можаце сказаць, якое дзяржаўнае свята адзначаецца 2 красавіка?

2 красавіка – Дзень аб'яднання народаў Беларусі і Расіі. Менавіта ў гэты дзень у 1996 годдзе быў падпісаны дагавор «Об образовании Сообщества России и Беларуси». Гэта дае магчымасць абодвум славянскім народам наладжваць сяброўскія адносіны ў галіне палітыкі, эканомікі, навукі і мастацтва. Напэўна, вы ведаеце, што кожны чацвер дадаткам да газеты "Савецкая Беларусія" з'яўляецца "Саюз". Рэпартажы, нататкі, інтэрв'ю карэспандэнтаў абедзвюх краін размяшчаюцца ў гэтым дадатку. А зараз прапаную вам выступіць у ролі журналіста. Вось пытанні, якія юныя карэспандэнты з Расійскай Федэрацыі адрасавалі вам. Давайце паспрабуем даць на іх адказы.

**Пытанні**

1. Раскажыце, калі ласка, чаму горад Магілёў мае  такую назву?
2. Якія знакамітыя мясціны ёсць у горадзе Магілёве?
3. Якія навучальныя ўстановы ёсць у горадзе Магілёве?
4. Чым вы любіце займацца ў вольны час?

- **Фізкультхвілінка.**

**4.Арфаграфічная хвілінка.**

**Настаўніца:** Каб стаць сапраўдным журналістам – трэба граматна пісаць і афармляць свае думкі. Я прапаную вам нататку, у якой трэба знайсці і выправіць памылкі.Правільны тэкст запішыце ў сшыткі,растлумачце правапіс.

«З нагоды Дня аб'яднання народаў *б*еларусі і *р*асіі а*т*бываюцца наступныя святочны*е* мерапрыемствы: урачыстыя пасяджэнні, канцэрты, сустрэчы, цырымоніі *у*знагароджвання прэміяй Саюзнай *д*яржавы ў галіне літаратуры і мастацтва».

Адным з жанраў публіцыстычнага стылю з’яўляецца ліст або пісьмо. Ліст можа быць асабістым, адрасаваны аднаму чалавеку, а можа пісацца калектыўна і адрасавацца пэўнай групе людзей. На адрас вашай школы прыйшоў **ліст**. Ад каго, аб чым, давайце пацікавімся. Вазьміце ў рукі блакітныя лісты (Дадатак 4), прачытайце, калі ласка. (*Выклікае аднаго вучня*).

**Памятка «Структуры ліста».**

1. З чаго пачынаецца ліст? (*Прывітанне, зварот*).

2. Аб чым паведамляецца ў асноўнай частцы ліста. (*З якой мэтай пішацца ліст. Паведамляюцца навіны. Выказваюцца пажаданні*).

3. Як заканчваецца ліст? (*Развітанне*).

*(У залежнасці ад узроўню паспяховасці класа, калі ёсць час, можна прапанаваць аналіз тэксту.)*

1. Назавіце зваротак. Як на пісьме выдзяляецца зваротак?

2. Знайдзіце сказы з аднароднымі членамі, зачытайце.

**5. Дамашняе заданне.** У якасці дамашняга задання я прапаную вам напісаць адказ маскоўскім школьнікам, карыстаючыся памяткай.

**6.Рэфлексія.**

**Настаўнік:** Давайце звернемся да мэты нашага ўрока і вызначым, ці дасягнулі мы яе.

- Вы паглыбілі веды пра публіцыстычны стыль?
- Пазнаёміліся з жанрамі публіцыстычнага стылю?
- Разгледзелі сферу выкарыстання …
- Калі ласка, завяршыце фразу.

*1. На ўроку мне больш за ўсё спадабалася…*

*2. Цяжкасці выклікала …*

*3. Больш за ўсё запомнілася…*

**Дадатак 1**

<u>Метад “Веру-не веру”</u>

Настаўнік зачытвае сцверджанні, а вучням прапануе згадзіцца ці не згадзіцца (так-не). Выкліканы выказвае свой пункт гледжання і аргументуе яго.

1. Публіцыстычны стыль выкарыстоўваецца ў газетах, часопісах, выступленнях на радыё, тэлебачанні, сходах.
2. Публіцыстычны стыль выкарыстоўваецца ў дакументах.
3. Задача публіцыстычнага стылю і сфера выкарыстання: паведамляць навіны культуры, навукі, грамадскага жыцця, пераконваць чытачоў і слухачоў, уздзейнічаць на іх, фарміраваць пэўныя адносіны да прадмета маўлення.
4. Публіцыстычны стыль выкарыстоўваецца ў бытавой сферы, пры штодзённых зносінах.
5. Жанры публіцыстычнага стылю: артыкул, рэпартаж, нарыс, адозва, нататка, заклік, выступленне, віншаванне, ліст, лістоўка, інтэрв’ю, дыспут і інш.
6. Асноўныя прыметы публіцыстычнага стылю: дакладнасць, доказнасць, лагічнасць.
7. Асноўныя прыметы публіцыстычнага стылю: пабуджальнасць, эмацыянальнасць, выразна выражаныя ацэначныя адносіны.

**Дадатак 2**

Характэрныя прыметы публіцыстычнага стылю

| | |
|---|---|
| Сфера выкарыстання | Абслугоўвае сферу грамадскіх адносін (выкарыстоўваецца ў перыядычным друку, палітычных выступленнях, прамовах, на радыё і тэлебачанні), адрасуецца шырокім масам |
| Функцыя стылю | Паведамляць навіны штодзённага жыцця, культуры, навукі, растлумачваць грамадска-палітычныя пытанні, эмацыянальна ўздзейнічаць на слухачоў (чытачоў) з мэтай |

| | |
|---|---|
| | уздзеяння на адрасата |
| Жанры | Артыкул, нататка, рэпартаж, інтэрв'ю, нарыс, агляд, аратарскае выступленне (прамова), заклік, віншаванне, ліст, лістоўка і іншыя |
| Стылёвыя адзнакі | Аператыўнасць і дакладнасць інфармацыі;<br>лагічнасць доказаў;<br>эмацыянальнасць, выразнасць, ацэначнасць, даступнасць;<br>вобразнасць, экспрэсіўнасць, пабуджальнасць;<br>узнёсласць мовы |
| Моўныя сродкі | Словы грамадска-палітычнага зместу(Айчына, роўнасць і г.д. );<br>формы дзеясловаў загаднага ладу (гляньце, звярніце ўвагу, няхай квітнее);<br>заклікі і запытанні (Хто не ведае? Жывіце дружна!);<br>звароткі, паўторы (Дарагія сябры! Суайчыннікі! Спадарства!);<br>сказы з аднароднымі членамі (Падпісваюць і выступаюць з сумеснай заявай) |

**Дадатак 3**

Жанры публіцыстычнага стылю

| | |
|---|---|
| 1.Кароткае паведамленне ў друку, разлічанае на эмацыянальнае ўздзеяння на чытача | А) Віншаванне |
| 2. Невялікае, звычайна навуковае сачыненне ў газеце, часопісе, зборніку | Б) Адозва |
| 3.Невялікі літаратурны твор, у якім апісваюцца рэальныя факты, падзеі, | В) Рэпартаж |

| | |
|---|---|
| асобы | |
| 4.Публічнае выступленне на сходзе | Г) Артыкул |
| 5.Вусная інфармацыя па радыё, паведамленне ў газеце аб здарэннях, падзеях і інш. | Д) Нататка |
| 6.Гутарка журналіста з якой-небудзь асобай, прызначаная для друку | Е) Прамова |
| 7.Вусны або пісьмовы зварот да мас | Ж) Нарыс |
| 8.Адкрытая спрэчка на навуковыя, літаратурныя і іншыя тэмы з удзелам усіх жадаючых | З) Інтэрв'ю |
| 9.Пісьмовае альбо вуснае выказванне ў сувязі з якой-небудзь радаснай, прыёмнай падзеяй | І) Дыспут |

**Дадатак 4**

Прывітанне, дарагія сябры-беларусы!

Звяртаюцца да вас шасцікласнікі Маскоўскай школы №721. Віншуем вас з Днём аб'яднання нашых народаў. Хаця мы яшчэ недастаткова дарослыя, але разумеем важнасць гэтай падзеі. Беларусы і расіяне спрадвеку жылі побач, дапамагалі адзін аднаму, разам адстойвалі сваю незалежнасць, пракладвалі шлях у будучыню.

Не так даўно ў Маскве праходзілі Дні беларускай культуры. Мы з цікавасцю наведвалі многія мерапрыемствы. Асабліва ўразіла выступленне артыстаў Магілёўскага лялечнага тэатра. Нам стала цікава, дзе знаходзіцца горад Магілёў, чым праславіўся, якія людзі там жывуць.

Наш клас жадае завязаць з вамі перапіску, бліжэй пазнаёміцца, пасябраваць. Чакаем адказу ад вас.

На развітанне нам хочацца пажадаць вам поспехаў у вучобе, працвітання беларускаму народу.

Вучні 6 “А” класа.